МІНІСТЭРСТВА ТРАНСПАРТУ І КАМУНІКАЦЫЙ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПАРТАМЕНТ ПА АВІЯЦЫІ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«НАЦЫЯНАЛЬНЫ АЭРАПОРТ МІНСК»

тэр. Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», 220054, г. Мінск
УНП 600048566, АКПА 011298885000
Тэл.: (017)279 18 38, факс: (017) 279 17 68
Сайт: www.airport.by E-mail: info@airport.by
Р/рахунак BY78AKBB30121583200135300000 у філіяле №514
ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Мінск, вул. Сурганава, 47а,
БІК AKBBBY21514

МИНИСТЕРСТВО ТРАНСПОРТА И КОММУНИКАЦИЙ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПАРТАМЕНТ ПО АВИАЦИИ

Республиканское унитарное предприятие
«НАЦИОНАЛЬНЫЙ АЭРОПОРТ МИНСК»

тер. Национального аэропорта «Минск», 220054, г. Минск
УНП 600048566, ОКПО 011298885000
Тел.: (017) 279 18 38, факс: (017) 279 17 68
Сайт: www.airport.by E-mail: info@airport.by
Р/счет BY78AKBB30121583200135300000 в филиале №514
ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Сурганова, 47а,
БИК AKBBBY21514

08.11.2017 № 1-12/Д-58-Эл

на № ____________ ад ____________

[redacted]
г. Мінск
[redacted]

Аб разглядзе звароту адносна выкарыстання беларускай мовы

Паважаны заяўнік!

У Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Нацыянальны аэрапорт Мінск» разгледзены Ваш зварот, накіраваны 01.11.2017 праз электронную пошту, адносна выкарыстання беларускай мовы ў абвестках аэрапорта, на інфармацыйных стэндах, шыльдах і ўказальніках, размешчаных у аэравакзальным комплексе аэрапорта. Паведамляем наступнае.

У сваёй дзейнасці па абслугоўванні пасажыраў і гасцей аэрапорта прадпрыемства цалкам кіруецца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, правіламі і стандартамі Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ICAO), распаўсюджанай практыкай дзейнасці іншых міжнародных аэрапортаў.

Інфармацыйныя надпісы, наяўныя на ўказальніках у аэравакзальным комплексе аэрапорта, а таксама гукавая трансляцыя інфармацыі афармлены і ажыццяўляюцца ў поўнай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, артыкул 13 «Мова ў сферы абслугоўвання» Закона Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1990 № 3094-XI «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» абвяшчае: «На транспарце, у гандлі, у сферы медыцынскага і бытавога абслугоўвання ўжываецца беларуская або руская мовы, а пры неабходнасці – іншыя мовы».

Такім чынам, сістэма інфармавання пасажыраў Нацыянальнагo аэрапорта Мінск у поўнай меры адпавядае патрабаванням дзеючага заканадаўства і выконвае сваё прызначэнне.

Дадаткова паведамляем, што Ваша заўвага будзе ўлічана пры ўдасканаленні працы інтэрнет-сайта прадпрыемства.

Дзякуем за Ваш зварот і ўвагу да дзейнасці Нацыянальнага аэрапорта Мінск.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў» Вы маеце права абскардзіць рашэнне, прынятае па Вашым звароце, у вышэйстаячы дзяржаўны орган – Дэпартамент па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь.

З павагай,

Намеснік генеральнага дырэктара па агульных пытаннях і рабоце з персаналам В.У.Палей

Гарай 279 15 69
08.11.2017